06.06.2020 / 10:41

Актывісты БРСМ разам з дэпутатам Клішэвічам памылкова накінуліся на Орду: «Колькі вам заплацілі?!» ВІДЭА

Актывісты БРСМ, якіх на пікет у падтрымку Аляксандра Лукашэнкі прывёў з сабой дэпутат-камуніст Сяргей Клішэвіч, уляпаліся ў скандал.

Некалькі маладзёнаў у рознакаляровых майках «Мінск БРСМ» — як выявілася, гэта студэнты Інстытута культуры, — хадзілі ўслед за здымачнай групай «Радыё Свабода» з адным пытаннем: «Колькі вам заплацілі?»

Карэспандэнт «Свабоды» даваў ім слова, але актывістаў БРСМ цікавіў толькі бюджэт радыёстанцыі і ганарар карэспандэнта Антона Трафімовіча, які вёў стрым.



Тым часам кіраўнік Федэрацыі прафсаюзаў Міхаіл Орда, які ўзначальвае ініцыятыўную групу Аляксандра Лукашэнкі, адказваў на пытанні журналістаў.

«Мы ўжо не 200 тысяч, а мільён [подпісаў] сабралі. Мы ідзем па жаданні людзей», — тлумачыў ён.

У гэты час да Орды падскочылі тыя самыя актывісты БРСМ. Відаць, яны паблыталі яго з кімсьці з альтэрнатыўных кандыдатаў. «Колькі вам заплацілі?» — накінуліся яны на Орду.

«На вашы гадасці адказваць не буду», — рэзюмаваў ён.



Беларусь головного мозга

Тэлеграм-канал Нехта ідэнтыфікаваў гэту групу актывістаў, якую прыцягнуў Клішэвіч. Пасля гэтага амаль усе хлопцы і дзяўчаты закрылі свае профілі ў сацыяльных сетках.

БЮ

ЧЫТАЙЦЕ ЯШЧЭ

Вераніка Цапкала: на ўсіх месцаў у турмах не хопіць, перамога непазбежна

Ганна Севярынец: Гэта пратэст супраць зла, калі ён бывае дарэмным?

«Дзядуля са слязьмі падыходзіў да кожнай і казаў «дзякуй». Жанчыны ў белым выйшлі супраць гвалту — як гэта было?

«Слова года для беларусаў — годнасць». Выкладчык Наталля Дуліна — пра выпрабаванні і чаму не трэба здавацца